З каталіцкіх СМІ (208)

Аўтар: Рэдакцыя
05.04.2020 00:00

Юбілей Філарэта ***Мітрапаліт Мінска- Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч павіншаваў Ганаровага Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі Мітрапаліта Філарэта з 85-годдзем. Старшыня ККББ прысутнічаў на святочнай літургіі ў хатнім храме Беларускага Экзархата і на прыёме ў гонар юбіляра.***

У віншавальным слове арцыбіскуп адзначыў: “Ваша настойлівасць, дыпламатычныя здольнасці, уменне распазнаваць знакі часу і хутка адказваць на іх прынеслі свой плён. Ваша адкрытасць для дыялогу дапамагла таксама і Каталіцкаму Касцёлу ў яго адраджэнні ў сучаснай Беларусі”. Напрыканцы іерарх падзякаваў Мітрапаліту Філарэту і пажадаў яму Божага бласлаўлення.

†

Хатнія аборты? ***Урад Вялікабрытаніі дазволіў жанчынам здзяйсняць фармакалагічны аборт дома.*** Цяпер жанчыны і дзяўчаты змогуць прымаць таблеткі для ранняга перапынення цяжарнасці самастойна. У той жа час урачы могуць прапісаць іх на адлегласці – праз відэазванок, тэлефонную канферэнцыю ці іншыя электронныя сродкі. Такі крок асудзілі ў асяроддзі абаронцаў жыцця, прыгадваючы, што гэта ставіць пад пагрозу здароўе і жыццё многіх жанчын, робячы магчымым амаль неабмежаванае ўжыванне сур’ёзнага сродка, які знішчае зачатае жыццё. На іх думку, прыхільнікі абортаў выкарыстоўваюць час крызісу, калі народ змагаецца з пандэміяй каронавіруса, каб здзейсніць ідэалагічныя змены.

“Дзённік” на YouTube ***Кангрэгацыя Сясцёр Маці Божай Міласэрнасці зрабіла даступнай радыёадаптацыю “Дзённіка” св. Фаўстыны Кавальскай. 119 частак працягласцю 8-10 хвілін можна знайсці на профілі “Фаўстына” ў сервісе YouTube.***

Першапачаткова запіс быў падрыхтаваны для радыёстанцый у 1990-я гады. З гады таму ў яго дадалі нехапаючыя эпізоды. “Дзённік” с. Фаўстыны Кавальскай належыць да жамчужын містычнай літаратуры. Манахіня пісала яго ў 1934–1938 гадах.